У наступныя двое сутак месцамі пройдуць невялікія кароткачасовыя ападкі, пераважна дождж, вецер заходні 6—11 метраў у секунду. Тэмпература паветра ўначы ад 1 градуса марозу да 4 градусаў цяпла, удзень 24-га — 5—10, 25-га — 3—8 градусаў вышэй нуля.

Астранамічны каляндар — 23.03

Узыход і заход сонца: Мінск — 6.06, 18.27; Віцебск — 5.55, 18.18; Магілёў — 5.55, 18.17; Гомель — 5.50, 18.15; Гродна — 6.18, 18.44; Брэст — 6.22, 18.43.

Даўжыня дня ў Мінску — 12 гадзін 21 мінута.

Маладзік — 23 сакавіка.

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб зацвярджэнні Палажэння аб парадку разгляду пытанняў прадастаўлення прытулку замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства

Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь пастанаўляе:

1. Зацвердзіць Палажэнне аб парадку разгляду пытанняў прадастаўлення прытулку замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства.

2. У сувязі з гэтым у назве і тэксце пастановы Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 2 верасня 1992 года "Аб пытаннях палітычнай эміграцыі" (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., N 23, арт. 397) словы "палітычнай эміграцыі" замяніць словамі "прадастаўлення прытулку замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства".

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С.ШУШКЕВІЧ.

25 лютага 1993 г.
г.Мінск.
N 2219-XII

Зацверджана ўказам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 25 лютага 1993 года

ПАЛАЖЭННЕ

Аб парадку разгляду пытанняў прадастаўлення прытулку замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства

Артыкул 1. Пытанні прадастаўлення прытулку замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства разглядаюцца ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, іншым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і гэтым Палажэннем.

Артыкул 2. Прытулак можа прадастаўляцца замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі і вымушаны пакінуць краіны пражывання з прычыны праследавання іх за палітычныя, рэлігійныя перакананні (калі яны не прапагандуюць варожасць паміж людзьмі і не прычыняюць шкоды іх здароўю) або за нацыянальную прыналежнасць.

Артыкул 3. Пытанні прадастаўлення прытулку разглядаюцца незалежна ад расавай і нацыянальнай прыналежнасці, полу, адукацыі, пры наяўнасці заявы зацікаўленай асобы за яе подпісам. Дакументы па пытаннях прадастаўлення прытулку падаюцца на імя Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь праз органы Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь па месцы жыхарства заяўніка. Заявы, якія паступілі непасрэдна ў Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, накіроўваюцца на разгляд ва ўказанае міністэрства.

Артыкул 4. Пры разглядзе заяў і афармленні матэрыялаў аб прадастаўленні прытулку запрошваюцца неабходныя дакументы, высвятляюцца абставіны прыбыцця і прычыны знаходжання заяўнікаў на тэрыторыі Беларусі, звесткі, якія характарызуюць асобу, крыніцу іх існавання, а таксама іншыя абставіны, што заслугоўваюць увагі.

Артыкул 5. Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе падрыхтоўку неабходных матэрыялаў разам з Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь, Камітэтам дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва, якія ў межах іх ведання прадстаўляюць неабходныя звесткі і даюць сваё заключэнне па кожнаму заяўніку.

Артыкул 6. Парадак афармлення, разгляду, праходжання дакументаў па пытаннях прадастаўлення прытулку ва ўказаных міністэрствах і ведамствах устанаўліваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Тэрмін разгляду заяў у кожным з указаных у артыкуле 5 гэтага Палажэння дзяржаўных органаў і Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь не павінен перавышаць аднаго месяца.

Артыкул 7. Усе наяўныя матэрыялы ў адносінах да асоб, якія просяць прытулку ў Рэспубліцы Беларусь, з заключэннем Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь аб магчымасці і мэтазгоднасці іх задавальнення накіроўваюцца ў Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 8. Матэрыялы, якія паступілі ў Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, папярэдне разглядаюцца Камісіяй пры Прэзідыуме Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па пытаннях прадастаўлення прытулку замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства. Пасяджэнне камісіі лічыцца правамоцным, калі ў ім удзельнічае больш паловы яе складу. Рашэнні прымаюцца простай большасцю галасоў членаў камісіі, якія прысутнічаюць на пасяджэнні.

Артыкул 9. На разгляд Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь камісіяй уносяцца матэрыялы пры наяўнасці яе прапановы аб прадастаўленні асобе прытулку. Аб заявах, па якіх камісія не знайшла падстаў для задавальнення просьбы аб прадастаўленні прытулку, даводзіцца да ведама Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і аб гэтым паведамляецца заяўнікам праз органы Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, якія займаліся афармленнем дакументаў.

Артыкул 10. Асобы, якім прадастаўлены прытулак, і члены іх сем'яў, што не з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, маюць тыя ж правы і свабоды, што і грамадзяне Рэспублікі Беларусь, за выключэннем права ўдзельнічаць у выбарах органаў улады Рэспублікі Беларусь, удзельнічаць ва ўсенародных і мясцовых рэферэндумах, а таксама назначацца на асобныя пасады або займацца пэўнай працоўнай дзейнасцю, калі для гэтага неабходна прыналежнасць да грамадзянства Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 11. Падрыхтоўка паступіўшых у Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь матэрыялаў аб прадастаўленні прытулку для разгляду камісіяй і Прэзідыумам ускладаецца на аддзел па пытаннях памілавання і грамадзянства Сакратарыята Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, які пры неабходнасці запрошвае дадатковыя матэрыялы для разгляду заяў аб прадастаўленні прытулку, меркаванні адпаведных дзяржаўных і грамадскіх органаў аб абгрунтаванасці і мэтазгоднасці іх задавальнення, можа даваць ім даручэнні аб праверцы асобных пытанняў.

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб Палажэнні аб парадку выдачы і афармлення паўнамоцтваў прадстаўнікам Рэспублікі Беларусь

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь пастанаўляе:

Зацвердзіць Палажэнне аб парадку выдачы і афармлення паўнамоцтваў прадстаўнікам Рэспублікі Беларусь (прыкладаецца).

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С.ШУШКЕВІЧ.

3 лютага 1993 г.
г.Мінск. N 2154-XII

Зацверджана пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 3 лютага 1993 года

Палажэнне

Аб парадку выдачы і афармлення паўнамоцтваў прадстаўнікам Рэспублікі Беларусь

1. У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Законам Рэспублікі Беларусь "Аб парадку заключэння, выканання і дэнансацыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь" і іншымі заканадаўчымі актамі для вядзення перагавораў і падпісання міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, удзелу ў рабоце міжнародных арганізацый і міжнародных канферэнцый дэлегацыям і асобам, а таксама дыпламатычным прадстаўнікам Рэспублікі Беларусь у замежных дзяржавах і кіраўнікам прадстаўніцтваў Рэспублікі Беларусь пры міжнародных арганізацыях паўнамоцтвы выдаюцца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь, Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь або Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі.

2. Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь выдаюцца паўнамоцтвы:

дэлегацыям і асобам на вядзенне перагавораў і падпісанне міжнародных дагавораў, якія заключаюцца ад імя Рэспублікі Беларусь;

асобам для правядзення абмену ратыфікацыйнымі граматамі міждзяржаўных дагавораў, якія заключаюцца ад імя Рэспублікі Беларусь.

Па рашэнню Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дэлегацыям і асобам могуць выдавацца адпаведныя паўнамоцтвы і ў іншых выпадках.

3. Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь выдаюцца паўнамоцтвы (вярыцельныя граматы):

дыпламатычным прадстаўнікам Рэспублікі Беларусь у замежных дзяржавах;

пастаянным прадстаўнікам Рэспублікі Беларусь пры міжнародных арганізацыях.

Па даручэнню Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, а таксама ў перыяд паміж сесіямі Вярхоўнага Савета Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь выдаюцца паўнамоцтвы дэлегацыям і асобам на вядзенне перагавораў і падпісанне міжнародных дагавораў, якія заключаюцца ад імя Рэспублікі Беларусь.

4. Паўнамоцтвы, якія выдаюцца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь і Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, падпісваюцца Старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, змацоўваюцца подпісам міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь і пячаткай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

5. Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь выдаюцца паўнамоцтвы:

дэлегацыям і прадстаўнікам Рэспублікі Беларусь на вядзенне перагавораў і падпісанне міжнародных дагавораў, якія заключаюцца ад імя Рэспублікі Беларусь па пытаннях, што адносяцца да кампетэнцыі ўрада Рэспублікі Беларусь;

дэлегацыям і прадстаўнікам Рэспублікі Беларусь на вядзенне перагавораў і падпісанне міжнародных дагавораў, якія заключаюцца ад імя ўрада Рэспублікі Беларусь;

дэлегацыям і прадстаўнікам урада Рэспублікі Беларусь на ўдзел у рабоце міжнародных органаў і падпісанне актаў, якія прымаюцца гэтымі органамі.

6. Паўнамоцтвы, якія выдаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, падпісваюцца Старшынёй Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, змацоўваюцца подпісам міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь і пячаткай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

7. Паўнамоцтвы, якія выдаюцца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь, Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь або Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, могуць выдавацца па іх даручэнню Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Паўнамоцтвы, якія выдаюцца Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь па даручэнню Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь або Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, падпісваюцца міністрам замежных спраў Рэспублікі Беларусь і загадчыкам дагаворна-прававога аддзела Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь і змацоўваюцца пячаткай Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

8. Усе паўнамоцтвы афармляюцца Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

9. Паўнамоцтвы ўсіх катэгорый афармляюцца на беларускай мове.

Так считает депутат

Не бросаясь головой в омут

Василий ШОЛОДОНОВ, Генеральный прокурор, народный депутат Республики Беларусь

Сбалансированность функций законодательной, исполнительной и судебной властей является основной проблемой при разработке проекта Конституции Республики Беларусь. Эти функции подлежат четкой регламентации в Основном Законе нашего государства. Только после этого можно вести речь о создании законодательной базы для каждой ветви власти. Отдельными законами формировать сбалансированность законодательной, исполнительной и судебной властей просто немыслимо. И в связи с этим хотелось бы сказать вот о чем.

На предстоящую внеочередную сессию Верховного Совета вынесены проекты Уголовно-процессуального, Уголовного, Гражданско-процессуального, Гражданского кодексов, законов о судоустройстве, следственном комитете и другие, которые фактически формируют судебную власть, ее принципы и порядок деятельности. Это, на мой взгляд, является преждевременным и не вызывается необходимостью со стороны практической деятельности.

Так, в проектах Уголовно-процессуального кодекса и Закона о судоустройстве предусмотрено создание окружных судов. Следовательно, сложившаяся система судов практически ликвидируется. Окружные суды, по мнению авторов проектов, могут создаваться как на базе одного, так и нескольких районов. Идея понятна. Но в то же время можно поставить вопрос: а станет ли лучше человеку, который ищет судебной защиты при условиях инфляции, дорожания проезда и юридических услуг и т.д.? Есть ряд и других весьма серьезных и спорных подходов в концепции формирования судебной власти. Но самое главное — это то, что она несвоевременна, так как не принята Конституция, предусматривающая сбалансированность функций трех ветвей власти.

Необходимость и важность построения правового государства, обеспечивающего приоритет прав и свобод человека, их охрану, верховенство закона во всех сферах общественной жизни, разделение законодательной, исполнительной и судебной властей, бесспорны. Однако пути и методы достижения поставленной цели могут быть разными по степени их эффективности. Это можно проследить, например, при анализе законопроекта "О следственном комитете".

Предлагается упразднить следственные аппараты в органах МВД, КГБ, прокуратуры и создать единый Следственный комитет. Авторы законопроекта считают создание независимого комитета одним из элементов гуманного правового государства. Не согласившись с этой точкой зрения авторов проекта, выскажу не только свое мнение и мнение участников расширенного заседания коллегии Прокуратуры Республики Беларусь, но, думаю, и многих практиков, ученых и простых граждан. В поддержку своей позиции выскажу лишь некоторые соображения.

Во-первых. Идея объединения следствия в одном ведомстве с наделением его исключительным, монопольным правом производства расследования по всем уголовным делам является теоретической. В практике многих государств мира подобных примеров не существует. Следствие в этих странах проводится различными ведомствами, которые обеспечивают объективность и полноту расследования конкретных уголовных дел.

Во-вторых. Нельзя не учитывать и того, что в сложившейся системе правоохранительных органов наиболее оптимально обеспечивается взаимодействие следственных аппаратов с ведомственными оперативными службами. Любая реформация не проходит без разрушения сложившихся отношений. Разрушение же взаимодействия следствия с оперативными службами приведет к формализму в исполнении последними поручений следователя, ослаблению общих усилий в борьбе с преступностью.

В-третьих. Вопрос обеспечения следственных аппаратов квалифицированными следователями и сейчас является больным. Можно лишь только надеяться на то, что в Следственный комитет перейдут полным составом следователи различных ведомств. Но надежда эта призрачна. Предвижу, что многие грамотные и перспективные следователи останутся в соответствующем ведомстве для работы на другой должности или в другой службе. Это и понятно, ведь руководители ведомств и их структурных подразделений не заинтересованы в утечке мозгов.

В-четвертых. Проблема материально-технического оснащения и финансирования всякого вновь создаваемого ведомства, а тем более Следственного комитета, является немаловажной. Но настораживает тот факт, что авторы законопроекта в его обосновании не приводят данных о планируемых общих затратах.

В-пятых. Ситуация, которую мы наблюдаем на протяжении последних лет, не дает оснований надеяться на спад преступности. Об этом красноречиво свидетельствуют следующие цифры. В 1992 году правоохранительными органами республики зарегистрировано 96.637 преступлений, что на 18,8 процента больше, чем в 1991 году. За полтора десятка последних лет уровень преступности из расчета на десять тысяч жителей республики увеличился вдвое.

Очевидно, что в случае создания Следственного комитета произойдет дезорганизация работы существующих следственных аппаратов и, естественно, снижение эффективности борьбы с преступностью. Можем ли мы сознательно пойти на это с учетом указанной выше ситуации, а также состояния и динамики преступности? Ведь в конечном итоге пострадают конкретные люди.

Анализируя изложенное, прихожу к выводу о том, что создание Следственного комитета не является панацеей от существующих в следствии проблем, а тем более не является единственным и бесспорным путем к достижению гуманных целей правового государства. На мой взгляд, эту же цель, не бросаясь головой в омут, можно достичь в рамках существующей структуры следствия, подвергнув ее необходимым изменениям.

Уже начата и проводится работа, направленная на обеспечение надлежащего уровня следствия, реорганизацию существующих следственных аппаратов с учетом специфики и направленности каждого из них.

Намеченные изменения, по моему мнению, должны включать в себя и приемлемые положения, содержащиеся в проекте Закона "О Следственном комитете". Такие, как введение института помощника следователя, а также касающиеся правовой и социальной защиты следователя.

Хотелось бы, чтобы в решении проблем судебно-правовой реформы не было спешки, необдуманности. Эти вопросы затрагивают интересы многих граждан, направлены на построение правового государства, на пути к которому нужно как можно более полно защитить законные права и интересы жителей республики, предприятий, учреждений, организаций.

Актуальнае інтэрв'ю

Суверэнізацыя судовай улады

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У цэлым у праекце закона ўтрымліваюцца адказы на пытанні аб структуры судовай улады, сістэме органаў правасуддзя, прынцыпах іх арганізацыі і дзейнасці, статусе суддзяў і шляхах прафесіяналізацыі судзейскага корпуса, узаемаадносінах суда з органамі, якія маюць дачыненне да арганізацыі суда і адпраўлення правасуддзя.

У адпаведнасці з праектам судовая ўлада належыць тром судовым органам: Канстытуцыйнаму суду, Вышэйшаму гаспадарчаму суду з яго структурамі і Вярхоўнаму суду з сістэмай агульных судоў. Спынюся на сістэме агульных судоў, арганізацыі якіх прысвечаны гэты праект. У чым яго навізна, у чым адрозненне ад дзеючага зараз закона аб судовым ладзе? Адрозненняў шмат, у тым ліку прынцыповых.

Так, ліквідуецца інстытут народных засядацеляў як цалкам зжыўшы сябе. Суд становіцца прафесіянальным. Сістэма судоў з трох звенняў пераўтвараецца ў чатырохзвенную.

Мяркуецца стварэнне мiравога суда, які дзейнічае на ўчастках, у мікрараёнах. Міравы суддзя разглядае ў аднаасобным парадку пэўныя катэгорыі грамадзянскіх, крымінальных і адміністрацыйных спраў, якія не вылучаюцца вялікай складанасцю.

Замест цяперашніх раённых (гарадскіх) народных судоў прадугледжваецца стварэнне прафесіянальных міжраённых або акруговых судоў, якія дзейнічаюць у судовай акрузе і разглядаюць судовыя справы як у індывідуальным, так і ў калегіяльным парадку.

Захоўваюцца цяперашнія абласныя і Мінскі гарадскі суды, якія працуюць на прафесіянальнай аснове і разглядаюць судовыя справы ў калегіяльным парадку. І нарэшце — Вярхоўны суд як вышэйшы орган судовай улады, які таксама разглядае судовыя справы ў калегіяльным парадку.

Уводзіцца суд прысяжных, які будзе разглядаць пэўныя катэгорыі крымінальных спраў.

У праекце замацаваны важнейшыя прынцыпы арганізацыі і функцыяніравання правасуддзя. Яны датычаць незалежнасці суддзяў і падпарадкавання іх толькі закону; роўнасці грамадзян перад законам і судом; іх права на судовую абарону; павагі да годнасці і правоў чалавека; ажыццяўлення правасуддзя ў дакладнай адпаведнасці з законам; галоснасці судовага разбору; непрадузятасці і справядлівасці суддзяў; прэзумпцыі невінаватасці; здаровага духу спаборніцтва; аб'ектыўнасці, усебаковасці і паўнаты даследавання акалічнасцей справы; нагляду вышэйстаячых судоў за законнасцю і справядлівасцю судовых рашэнняў. На падставе гэтых прынцыпаў суд заклiканы забяспечваць абарону правоў і свабод грамадзян, гарантаваных Канстытуцыяй і іншымі заканадаўчымі актамі, канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў.

— Што ўключае ў сябе паняцце статусу суддзяў?

— Пад статусам суддзі разумеецца яго прававое становішча. Паколькі суддзі з'яўляюцца носьбітамі судовай улады, то іх прававое становішча павінна быць дакладна вызначана і замацавана ў законе, чаго раней не было. Праект закона вызначае суддзяў як асоб, надзеленых у канстытуцыйным парадку паўнамоцтвамі на ажыццяўленне правасуддзя.

Заканадаўчае замацаванне высокага статусу суддзяў мае на ўвазе неабходнасць прад'яўлення павышаных патрабаванняў не толькі да іх прафесіянальных, але і да маральных якасцей. У цеснай сувязі з гэтым знаходзяцца палажэнні аб тым, што суддзі пры выкананні сваіх паўнамоцтваў, а таксама ў пазаслужбовых адносінах павінны пазбягаць усяго, што магло б прыменшыць аўтарытэт судовай улады, годнасць суддзі або выклікаць сумненне ў яго аб'ектыўнасці. Акрамя гэтага, устанаўліваецца, што суддзя не можа быць дэпутатам, належаць да палітычных партый і рухаў, займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю, займаць якія-небудзь іншыя пасады. Гэтыя абставіны набываюць асаблівую значнасць у сувязі з тым, што праект закона не абмяжоўвае паўнамоцтвы суддзяў пэўным тэрмінам (акрамя прызначаных упершыню на пяцігадовы тэрмін) і гарантуе іх нязменнасць.

У адпаведнасці з праектам закона суддзёй можа быць грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 25-гадовага ўзросту, мае вышэйшую юрыдычную адукацыю, не дапусціў учынкаў, што яго ганьбяць, прайшоў ва ўстаноўленым парадку стажыроўку на працягу двух гадоў і здаў кваліфікацыйны экзамен. Як бачна, патрабаванні да суддзі дастаткова высокія. Ды інакш і быць не павінна ў цывілізаваным грамадстве.

З мэтай забеспячэння незалежнасці суддзі праект закона ўстанаўлівае яго недатыкальнасць, якая распаўсюджваецца на яго жыллё і службовае памяшканне, выкарыстоўваемыя ім транспарт і сродкі сувязі, яго карэспандэнцыю, належачыя яму маёмасць і дакументы. Акрамя гэтага, суддзя не можа быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасці без згоды кваліфікацыйнай калегіі суддзяў і органа, які яго выбраў або прызначыў. Крымінальная справа ў адносінах да суддзі можа быць заведзена толькі Генеральным пракурорам рэспублікі.

Праект закона прадугледжвае таксама дастойнае матэрыяльнае і сацыяльнае забеспячэнне суддзяў, іх прававую і сацыяльную абарону. Сюды ўключаны пытанні забеспячэння суддзяў жыллём, дзяржаўнага страхавання, прызначэння пенсіі і г.д. У праекце закона прама сказана, што суддзі, члены іх сем'яў і іх маёмасць знаходзяцца пад асобай аховай дзяржавы. Для абароны сваіх прафесіянальных інтарэсаў, развіцця творчых пачаткаў у дзейнасці суддзяў апошнія могуць утвараць судзейскія таварыствы, органы судзейскага самакіравання. Так, зараз суддзі рэспублікі аб'ядналіся ў Асацыяцыю суддзяў.

— У якіх адносінах з судамі знаходзяцца Міністэрства юстыцыі і яго органы на месцах? Часам выказваецца меркаванне аб тым, што міністэрства замахваецца на незалежнасць суддзяў, умешваецца ў іх дзейнасць. Наколькі яно справядлівае?

— Зусім несправядлівае. Яшчэ некалькі гадоў назад з органаў юстыцыі была знята функцыя так званага арганізацыйнага кіраўніцтва судамі. Але і тады, калі яна дзейнічала, органы юстыцыі не ўмешваліся ў дзейнасць судоў па ажыццяўленню правасуддзя, не замахваліся на незалежнасць суддзяў пры разглядзе спраў. Зараз у Палажэнні аб Міністэрстве юстыцыі і ў праекце разглядаемага закона сказана, што міністэрства ажыццяўляе арганізацыйнае забеспячэнне дзейнасці судоў, якое складаецца з наступных састаўных частак: падрыхтоўка і ўнясенне прапаноў па арганізацыі судоў у рэспубліцы; сумесны з судамі падбор і падрыхтоўка кандыдатаў у суддзі; павышэнне кваліфікацыі кадраў судоў; арганізацыя работы па матэрыяльна-тэхнічнаму забеспячэнню і стварэнню належных умоў іх дзейнасці; вядзенне судовай статыстыкі; выкананне судовых рашэнняў; распрацоўка і ажыццяўленне мер, накіраваных на ўмацаванне незалежнасці суддзяў. Як бачыце, гаворка ідзе пра пытанні, якія не тычацца непасрэдна разгляду судовых спраў, а толькі стварэння неабходных умоў для нармальнай работы судоў. Падсумоўваючы сказанае, хачу падкрэсліць, што прыняцце закона "Аб судовай уладзе і статусе суддзяў", рэалізацыя яго палажэнняў дазволяць суду заняць дастойнае месца ў структуры дзяржаўнай улады і сваёй дзейнасцю актыўна ўплываць на працэсы фарміравання прававой дзяржавы і грамадства ў цэлым у нашай рэспубліцы.

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб плане фарміравання і выкарыстання Дзяржаўнага валютнага фонду Рэспублікі Беларусь на 1993 год

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь пастанаўляе:

1. Зацвердзіць план фарміравання і выкарыстання Дзяржаўнага валютнага фонду Рэспублікі Беларусь на 1993 год.

2. Устанавіць, што размеркаванне сродкаў Дзяржаўнага валютнага фонду Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца толькі на агульнадзяржаўныя патрэбнасці, указаныя ў раздзеле II плана фарміравання і выкарыстання Дзяржаўнага валютнага фонду Рэспублікі Беларусь.

3. Прадаставіць права Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь на працягу бюджэтнага года карэкціраваць сумы фінансавання артыкулаў расходаў Дзяржаўнага валютнага фонду Рэспублікі Беларусь у залежнасці ад фактычнай наяўнасці валютных сродкаў.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С.ШУШКЕВІЧ.

5 лютага 1993 г.
г.Мінск. N 2185-XII

Зацверджаны пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 5 лютага 1993 года N 2185-XII

План

фарміравання і выкарыстання Дзяржаўнага валютнага фонду Рэспублікі Беларусь на 1993 год

(млн.долараў ЗША)

Назва паказчыкаў	1993 год (прагноз)
I. ДАХОДЫ	
Паступленне валютнай выручкі ў Дзяржаўны валютны фонд Рэспублікі Беларусь	180,0
у тым ліку:	
- падатковыя паступленні	60,0
- абавязковы продаж	108,0
- іншыя паступленні (зборы, пошліны і г.д.)	12,0
РАЗАМ ДАХОДАЎ	180,0
II. РАСХОДЫ	
1. Узносы ў міжнародныя фінансавыя арганізацыі	5,0
2. Узносы ў арганізацыі сістэмы ААН і іншыя арганізацыі	15,0
3. Адкрыццё і ўтрыманне пасольстваў і іншых замежных установаў	7,0
4. Камандзіраванне дэлегацый і іншыя неадкладныя расходы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь	3,0
5. Закупка медыкаментаў і харчовых тавараў	50,0
6. Выплаты, звязаныя з абслугоўваннем і пагашэннем крэдытаў, атрыманых пад дзяржаўныя праграмы і гарантыі ўрада	90,0
7. Рэзерв на неадкладныя патрэбы	10,0
РАЗАМ РАСХОДАЎ	180,0

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб патэнтах на прамысловыя ўзоры

Раздзел I. Прамысловы ўзор і яго прававая ахова

Артыкул 1. Умовы патэнтаздольнасці прамысловага ўзору

1. Прамысловы ўзор уяўляе сабой мастацкае або мастацка-канструктарскае рашэнне, што вызначае вонкавы выгляд вырабу. Прамысловыя ўзоры могуць быць аб'ёмнымі (мадэлі), плоскаснымі (малюнкі) або камбінаванымі.

2. Прамысловаму ўзору прадастаўляецца прававая ахова, калі ён з'яўляецца новым, арыгінальным і прамыслова прымяняльным.

Прамысловы ўзор прызнаецца новым, калі сукупнасць істотных прымет невядомая ў Рэспубліцы Беларусь або за мяжой да даты яго прыярытэту.

Пры ўстанаўленні навізны заяўленага прамысловага ўзору ўсе раней пададзеныя неадазваныя заяўкі, акрамя заявак тых жа аўтараў, і прызнаныя патэнтаздольнымі ў Рэспубліцы Беларусь прамысловыя ўзоры ўлічваюцца з даты прыярытэту.

Прамысловы ўзор прызнаецца арыгінальным, калі яго істотныя прыметы або (і) іх камбінацыя адрозніваюцца своеасаблівасцю.

Істотныя прыметы вызначаюць адрозненні вонкавага выгляду вырабу ў эстэтычных і эрганамічных асаблівасцях, у тым ліку яго формы, канфігурацыі, арнамент або спалучэнні колераў.

Прамысловы ўзор прызнаецца прамыслова прымяняльным, калі ён можа быць узноўлены прамысловым спосабам у адпаведным вырабе для ўвядзення ў гаспадарчы абарот.

3. Не прадастаўляецца прававая ахова ў адпаведнасці з гэтым Законам рашэнням:

абумоўленым выключна тэхнічнай функцыяй;

якія супярэчаць грамадскім інтарэсам, прынцыпам гуманнасці і маралі;

аб'ектаў архітэктуры (у тым ліку прамысловых, гідратэхнічных і іншых стацыянарных збудаванняў), акрамя малых архітэктурных форм;

друкаванай прадукцыі як такой;

аб'ектаў няўстойлівай формы з вадкіх, газападобных, сыпучых і да іх падобных рэчываў.

4. Не прызнаецца акалічнасцю, што ўплывае на патэнтаздольнасць прамысловага ўзору, раскрыццё інфармацыі, што адносіцца да прамысловага ўзору, заяўнікам (аўтарам) або любой асобай, якая атрымала ад яго прама або ўскосна гэту інфармацыю, пры якой звесткі аб сутнасці прамысловага ўзору сталі агульнадаступнымі, калі раскрыццё ажыццёўлена не раней чым за шэсць месяцаў да даты паступлення заяўкі ў Дзяржаўнае патэнтнае ведамства Рэспублікі Беларусь пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь[1]. Пры гэтым абавязак даказвання дадзенай акалічнасці ляжыць на заяўніку.

Артыкул 2. Аўтарства на прамысловы ўзор

1. Аўтарам прамысловага ўзору прызнаецца грамадзянін, у выніку творчай працы якога ўзор створаны.

Калі прамысловы ўзор створаны сумеснай творчай працай некалькіх грамадзян, то ўсе яны прызнаюцца сааўтарамі прамысловага ўзору. Парадак карыстання правамі на прамысловы ўзор, створаны ў сааўтарстве, вызначаецца пагадненнем паміж сааўтарамі.

2. Не прызнаюцца сааўтарамі грамадзяне, якія не ўнеслі асабістага творчага ўкладу ў стварэнне прамысловага ўзору, а аказалі аўтару толькі тэхнічную, арганізацыйную або матэрыяльную дапамогу або садзейнічалі афармленню правоў на прамысловы ўзор і выкарыстанню прамысловага ўзору.

3. Аўтару прамысловага ўзору належыць права аўтарства, якое з'яўляецца неадчужальным асабістым правам. Аўтарства на прамысловы ўзор ахоўваецца бестэрмінова.

Артыкул 3. Прававая ахова прамысловага ўзору

1. Права на прамысловы ўзор ахоўваецца дзяржавай і сведчыцца патэнтам.

2. Патэнт па прамысловы ўзор сведчыць аўтарства на прамысловы ўзор, прыярытэт прамысловага ўзору і выключнае права на выкарыстанне прамысловага ўзору.

3. Аб'ём прававой аховы, што прадастаўляецца патэнтам на прамысловы ўзор, вызначаецца сукупнасцю яго істотных прымет, прадстаўленых на фотаздымках вырабу (макета, малюнка).

Апісанне прамысловага ўзору служыць толькі для тлумачэння прымет.

4. Патэнт на прамысловы ўзор дзейнічае на працягу дзесяці гадоў, лічачы з даты паступлення заяўкі ў Патэнтнае ведамства. Па хадайніцтву патэнтаўладальніка дзеянне патэнта працягваецца Патэнтным ведамствам на тэрмін да пяці гадоў, калі гэта не супярэчыць палажэнням гэтага Закона.

Артыкул 4. Патэнтаўладальнік

1. Патэнт на прамысловы ўзор выдаецца:

аўтару (аўтарам) прамысловага ўзору;

наследніку аўтара прамысловага ўзору;

грамадзяніну (грамадзянам) або юрыдычнай асобе (асобам), якія ўказаны аўтарам прамысловага ўзору ў заяўцы на выдачу патэнта або ў заяве, пададзенай у Патэнтнае ведамства да ўнясення прамысловага ўзору ў Дзяржаўны рэестр прамысловых узораў Рэспублікі Беларусь[2], пры наяўнасці дагавора.

2. Патэнт на прамысловы ўзор выдаецца работадаўцу, па заданню якога створаны прамысловы ўзор, калі паміж работнікам і работадаўцам заключаны адпаведны дагавор.

Пры гэтым работнік абавязаны пісьмова паведаміць работадаўцу аб стварэнні прамысловага ўзору.

Работадавец у сваю чаргу павінен на працягу трох месяцаў з дня атрымання паведамлення пісьмова заявіць работніку, ці дамагаецца ён прамысловага ўзору.

Прамысловы ўзор лічыцца створаным у парадку службовага задання, калі ён адносіцца да галіны дзейнасці работадаўца, і пры ўмове, што дзейнасць, якая прывяла да стварэння прамысловага ўзору, адносіцца да службовых абавязкаў аўтара.

Калі паміж работнікам і работадаўцам не заключаўся ўказаны дагавор або работадавец адмовіцца ад дамаганняў, то патэнт выдаецца аўтару прамысловага ўзору. Работадавец мае права выкарыстаць гэты прамысловы ўзор на ўмовах, што вызначаюцца ліцэнзійным дагаворам.

Артыкул 5. Выключнае права на выкарыстанне прамысловага ўзору

1. Выключнае права на выкарыстанне прамысловага ўзору належыць патэнтаўладальніку.

Ніхто не можа выкарыстаць прамысловы ўзор, на які выдадзены патэнт, без згоды патэнтаўладальніка.

2. Выключнае права на выкарыстанне прамысловага ўзору прадастаўляе патэнтаўладальніку магчымасць выкарыстоўваць прамысловы ўзор паводле свайго меркавання, калі гэта не парушае правоў іншых патэнтаўладальнікаў, а таксама забараняць выкарыстанне прамысловага ўзору ў выпадках, якія супярэчаць гэтаму Закону.

Патэнтаўладальнік павінен выкарыстоўваць правы, якія прадастаўляюцца патэнтам, без нанясення ўрону правам іншых грамадзян, інтарэсам грамадства і дзяржавы.

3. Парушэннем правоў патэнтаўладальніка прызнаюцца выраб, прымяненне, увоз, прапанова да продажу, продаж і іншае ўвядзенне ў гаспадарчы абарот вырабу з выкарыстаннем запатэнтаванага прамысловага ўзору без згоды патэнтаўладальніка.

Артыкул 6. Дзеянні, якія не прызнаюцца парушэннем выключнага права на выкарыстанне прамысловага ўзору

Не прызнаецца парушэннем выключнага права на выкарыстанне прамысловага ўзору:

прымяненне сродкаў, у якіх выкарыстаны прамысловыя ўзоры, абароненыя патэнтамі, на борце марскіх або рачных суднаў іншых краін, у корпусе судна, у машынах, аснастцы, механізмах і іншым абсталяванні, калі гэтыя судны часова або выпадкова знаходзяцца ў водах Рэспублікі Беларусь, пры ўмове, што ўказаныя сродкі выкарыстоўваюцца выключна для патрэб судна;

прымяненне сродкаў, у якіх выкарыстаны прамысловыя ўзоры, абароненыя патэнтамі, у канструкцыі або пры эксплуатацыі паветраных, касмічных або наземных сродкаў перамяшчэння або дапаможнага абсталявання для гэтых сродкаў іншых краін, калі ўказаныя сродкі перамяшчэння часова або выпадкова знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Указаныя дзеянні не прызнаюцца парушэннем выключнага права на выкарыстанне прамысловага ўзору, калі марскія або рачныя судны, паветраныя, касмічныя або наземныя сродкі перамяшчэння належаць грамадзянам або юрыдычным асобам краін, якія прадастаўляюць такія ж правы грамадзянам і юрыдычным асобам Рэспублікі Беларусь;

правядзенне навуковага даследавання або эксперымента над сродкам, у якім выкарыстаны прамысловы ўзор, абаронены патэнтам;

прымяненне сродкаў, у якіх выкарыстаны прамысловыя ўзоры, абароненыя патэнтамі, пры стыхійных бедствах, катастрофах, эпідэміях і іншых надзвычайных абставінах;

прымяненне сродкаў, у якіх выкарыстаны прамысловыя ўзоры, абароненыя патэнтамі, у прыватным парадку без камерцыйных мэт;

прымяненне сродкаў, у якіх выкарыстаны прамысловыя ўзоры, абароненыя патэнтамі, калі гэтыя сродкі ўведзены ў гаспадарчы абарот законным шляхам.

Артыкул 7. Права папярэдняга карыстання

Любы грамадзянін або юрыдычная асоба, якія да даты прыярытэту прамысловага ўзору, што ахоўваецца патэнтам, і незалежна ад яго аўтара стварылі і выкарысталі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь тоеснае прамысловаму ўзору рашэнне або зрабілі неабходную падрыхтоўку да яго выкарыстання, захоўваюць права на далейшае бязвыплатнае выкарыстанне такога ўзору без пашырэння аб'ёму яго выкарыстання.

Права папярэдняга карыстання можа быць перададзена грамадзяніну або юрыдычнай асобе толькі сумесна з вытворчасцю, на якой мела месца выкарыстанне або была зроблена неабходная да гэтага падрыхтоўка.

Артыкул 8. Заяўка на выдачу патэнта

1. Заяўка на выдачу патэнта на прамысловы ўзор[3] падаецца ў Патэнтнае ведамства:

аўтарам;

работадаўцам пры наяўнасці ўмовы, прадугледжанай пунктам 2 артыкула 4 гэтага Закона;

грамадзянінам або юрыдычнай асобай, якой аўтар або работадавец перадалі на дагаворнай аснове свае права на падачу заяўкі або да якой яно перайшло па спадчыне.

Заяўка можа быць пададзена праз патэнтнага паверанага, зарэгістраванага ў Патэнтным ведамстве.

2. Грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, або юрыдычныя асобы, што маюць пастаяннае месцазнаходжанне ў замежных краінах, ці іх патэнтныя паверэныя вядуць у Рэспубліцы Беларусь справы па атрыманню патэнтаў і падтрыманню іх у сіле праз беларускіх патэнтных паверэных, зарэгістраваных у Патэнтным ведамстве.

3. Заяўка павінна адносіцца да аднаго прамысловага ўзору і можа ўключаць яго варыянты.

4. Заяўка павінна змяшчаць:

заяву аб выдачы патэнта з указаннем аўтара (сааўтараў) прамысловага ўзору і асобы (асоб), на імя якой (якіх) запрошваецца патэнт, а таксама іх месцажыхарства і месцазнаходжання;

камплект фотаздымкаў вырабу (макета, малюнка), якія даюць поўнае і дэталёвае ўяўленне аб вонкавым выглядзе вырабу;

апісанне прамысловага ўзору, якое ўключае сукупнасць яго істотных прымет;

чарцёж агульнага выгляду вырабу, эрганамічную схему, канфекцыйную карту, калі яны неабходныя для раскрыцця сутнасці прамысловага ўзору;

даверанасць (у выпадку падачы заяўкі патэнтным паверэным).

Заяўка павінна змяшчаць дакумент, які пацвярджае выплату пошліны ва ўстаноўленым размеры ці вызваленне ад выплаты пошліны або наяўнасць падстаў для змяншэння яе размеру.

Патрабаванні да дакументаў заяўкі ўстанаўліваюцца Патэнтным ведамствам.

Артыкул 9. Пераход права на патэнт і правоў, якія вынікаюць з патэнта

Права на патэнт і правы на выкарыстанне прамысловага ўзору, якія вынікаюць з патэнта, могуць быць па дагавору перададзены іншаму грамадзяніну або юрыдычнай асобе. Дагавор рэгіструецца ў Патэнтным ведамстве. Дагавор без рэгістрацыі лічыцца несапраўдным.

Права на падачу заяўкі і патэнт на прамысловы ўзор, выключнае права на выкарыстанне прамысловага ўзору, а таксама права на ўзнагароджанне і даходы ад выкарыстання прамысловага ўзору пераходзяць па спадчыне.

Артыкул 10. Прыярытэт прамысловага ўзору

1. Прыярытэт прамысловага ўзору ўстанаўліваецца па даце паступлення заяўкі ў Патэнтнае ведамства, якая змяшчае заяву, камплект фотаздымкаў вырабу і апісанне прамысловага ўзору.

2. Прыярытэт прамысловага ўзору можа ўстанаўлівацца па даце падачы першай заяўкі на прамысловы ўзор у замежнай краіне — удзельніцы Парыжскай канвенцыі па ахове прамысловай уласнасці, калі ў Патэнтнае ведамства заяўка на прамысловы ўзор паступіла на працягу шасці месяцаў з указанай даты.

Заяўнік, які жадае выкарыстаць права канвенцыйнага прыярытэту, абавязаны ўказаць гэта пры падачы заяўкі або на працягу трох месяцаў з даты паступлення заяўкі ў Патэнтнае ведамства і прыкласці неабходныя дакументы, што пацвярджаюць правамернасць такога патрабавання.

3. Прыярытэт прамысловага ўзору, выкарыстанага ў экспанаце, прадстаўленым на афіцыяльнай або афіцыяльна прызнанай міжнароднай выстаўцы, арганізаванай на тэрыторыі адной з краін — удзельніц Парыжскай канвенцыі па ахове прамысловай уласнасці, устанаўліваецца па даце пачатку адкрытага паказу экспаната на выстаўцы, калі заяўка пададзена не пазней шасці месяцаў пасля гэтай даты.

Артыкул 11. Экспертыза заяўкі на выдачу патэнта на прамысловы ўзор

1. Экспертыза заяўкі на прамысловы ўзор ажыццяўляецца Патэнтным ведамствам у адпаведнасці з гэтым Законам і правіламі, устаноўленымі Патэнтным ведамствам на яго аснове.

2. У месячны тэрмін з даты паступлення заяўкі Патэнтнае ведамства паведамляе заяўніку аб прыняцці заяўкі да разгляду, або аб неабходнасці дапаўнення яе матэрыяламі, якіх не хапае, або аб адмове ў прыняцці заяўкі да разгляду.

У выпадку адмовы ў прыняцці заяўкі да разгляду заяўнік на працягу двух месяцаў з даты атрымання паведамлення мае права падаць у Патэнтнае ведамства пярэчанне, рашэнне па якому прымаецца на працягу месяца з дня яго паступлення.

3. Заяўка, прынятая да разгляду, правяраецца на адпаведнасць умовам патэнтаздольнасці прамысловага ўзору.

Пры невыкананні заяўнікам патрабаванняў пункта 3 артыкула 8 гэтага Закона экспертыза праводзіцца толькі ў адносінах да рашэння, указанага ў апісанні першым, калі заяўнік у адказ на паведамленне экспертызы аб устаноўленым парушэнні гэтых патрабаванняў не паведаміў аб падачы выдзеленай заяўкі (заявак) або не звярнуўся з просьбай абмежавацца разглядам аднаго з прамысловых узораў, якія змяшчаюцца ў заяўцы.

4. Не прымаюцца да разгляду дадатковыя матэрыялы, якія змяняюць сукупнасць істотных прымет прамысловага ўзору. Яны могуць быць афармлены заяўнікам у якасці самастойнай заяўкі з устанаўленнем прыярытэту па даце іх паступлення ў Патэнтнае ведамства.

Дадатковыя матэрыялы па запыту Патэнтнага ведамства павінны быць прадстаўлены ў двухмесячны тэрмін з дня атрымання запыту.

Калі заяўнік парушыў указаны тэрмін або пакінуў запыт без адказу, заяўка лічыцца адкліканай.

Па выніках экспертызы Патэнтнае ведамства прымае рашэнне аб выдачы або аб адмове ў выдачы патэнта.

5. Заяўкі, прынятыя да разгляду, заяўніку не вяртаюцца.

6. Калі ў працэсе экспертызы ўстаноўлена, што заяўкі на тоесныя прамысловыя ўзоры маюць адну і тую ж дату прыярытэту, то са згоды заяўнікаў ім выдаецца адзін патэнт.

Пры недасягненні згоды патэнт на прамысловы ўзор не выдаецца да вырашэння пытання ў Патэнтным судзе Рэспублікі Беларусь[4].

Артыкул 12. Правы заяўніка

1. У перыяд правядзення экспертызы заяўнік мае права:

па ўласнай ініцыятыве дапаўняць, удакладняць або выпраўляць матэрыялы заяўкі без змянення сукупнасці істотных прымет прамысловага ўзору;

пры парушэнні патрабаванняў пункта 3 артыкула 8 гэтага Закона падаць ва ўстаноўленым парадку выдзеленую заяўку;

адклікаць заяўку да рэгістрацыі прамысловага ўзору ў Рэестры прамысловых узораў;

запатрабаваць копіі патэнтных матэрыялаў, якія проціпастаўляюцца заяўцы, у двухмесячны тэрмін з даты атрымання рашэння па заяўцы;

пры нязгодзе з рашэннем экспертызы падаць матываваную скаргу ў Апеляцыйны савет патэнтнай экспертызы пры Патэнтным ведамстве[5] ў трохмесячны тэрмін з дня атрымання рашэння або запатрабаваных копій матэрыялаў, якія проціпастаўляюцца заяўцы. Скарга павінна быць разгледжана ў чатырохмесячны тэрмін з дня яе атрымання;

